# ВОБРАЗ КІРАЎНІКА ПАЎСТАННЯ 1863–1864 ГГ. У ТВОРЧАСЦІ Э. АЖЭШКІ І У. С. КАРАТКЕВІЧА

**А. А. Агрэніч**

Паўстанне 1863–1864 гг. было агульным для беларускага і польскага народаў, аднак гістарыяграфіі нашых краін называюць яго па-рознаму: калі палякі апелююць назвай «студзеньскае паўстанне», то беларусы згадваюць «паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага».

І калі беларускі бок ведае толькі аднаго свайго правадыра, то польская гістарыяграфія, акрэсліваючы паняцце «польскі кіраўнік паўстання 1863–1864 гг.», фіксуе тры імені: Марыян Лангевіч, Людвік Мераслаўскі і Рамуальд Траўгут. Кожны з іх зрабіў вялікі ўнёсак у пачэсную справу барацьбы за волю і справядлівасць на роднай зямлі. Але найбольш трагічнай, а разам з тым прыцягальнай і яскравай асобай з вышэй пералічаных з'яўляецца асоба Р. Траўгута.

Беларус К. Каліноўскі і паляк Р. Траўгут аддалі жыццё дзеля свабоды сваіх народаў, якой, на жаль, так і не атрымалі, але разам з тым распачалі другое жыццё – у мастацкай літаратуры.

Для Э. Ажэшкі Р. Траўгут не проста гістарычная асоба, да вобразу якой яна ў пэўны момант жыцця звярнулася ў творчасці. Ён сучаснік і аднадумца, натхняльнік і духоўны арыенцір, герой, якога жанчына самаахвярна спрабавала ўратаваць у сваю дваццаць першую вясну.

Без іншасказанняў і замоўчванняў Э. Ажэшцы ўдалася звярнуцца да вобраза Р. Траўгута толькі на захадзе свайго жыцця ў зборніку навел «Gloria victis» (1910). Як зазначыла беларускі літаратуразнаўца С. П. Мусіенка, акурат у гэтай кнізе ўпершыню ў мастацкай літаратуры прагучала імя апошняга кіраўніка польскага паўстання [2, с. 36].

У навеле «Яны» («Oni»), што распачынае зборнік, Э. Ажэшка ўзгадвае пераломны момант сваёй маладосці, калі ў яе жыццё ўварвалася паўстанне: «У вялікім вытанчаным доме вяліся шумныя размовы прыблізна трыццаці мужчын рознага ўзросту і рознага выгляду. <…> Гэта былі члены паўстанцкай арганізацыі некалькіх палескіх паветаў, што чакалі прыезду аднаго са сваіх суайчыннікаў, які сёння мусіў ім паведаміць, што альбо прымае камандаванне над мясцовым узброеным аддзелам, альбо адмаўляецца ад яго» [5, с. 2].

Пісьменніца стварае атмасферу таямнічасці. Усе размовы раяцца вакол пакуль не знаёмага чытачу інсургента. Э. Ажэшка пазбягае персаналізацыі ўдзельнікаў сходу, яны выступаюць як адзіны герой, што ў трымценні чакае выключную асобу, здольную змяніць ход гісторыі.

Э. Ажэшка параўноўвае «таго самага» – мы разумеем, што на ўвазе яна мае Р.Траўгута, – з антычнымі героямі: «Той, хто ўзяўся за гэтую задачу, мусіў мець плечы Атласа і сэрца, што пагарджае Дамоклавымі мячамі. Мноства мячоў было скіравана на яго гэтай задачай і на іх крываваліся надпісы: Адказнасць, Пакута, Смерць. Трэба было кінуць усё, што было мілае сэрцу, любімае, спакойнае, бяспечнае, і пайсці паміж гэтых мячоў, у іх бліскавіцы і ў іх смяротныя пашчы. Трэба было перамагчы ці загінуць, трэцяга выхаду не існавала» [5, с. 3].

Шматгалоссе абмяркоўвае «таго адзінага», прыгадваючы толькі станоўчыя яго рысы. Без наяўнасці на старонках кнігі героя, пра якога ідзе гаворка, чытач даведваецца, што той чалавек смелы, адказны, верны свайму слову, глыбока паважаны ўсімі прысутнымі. І ўрэшце рэшт, чуецца тупат коней і ў пакоі гучыць доўгачаканае: Р. Траўгут.

Пісьменніца стварае вобраз велічнага чалавека, спакойнага, які больш слухае, чым кажа, а гаворыць толькі па справе. Яго голас адразу вельмі выдзяляецца сярод згаданай вышэй паліфаніі. На прапанову стаць на чале паўстання ён адказвае сцісла і годна: «Я вярнуўся з далёкіх мясцін сюды з думкай, што мае паслугі могуць цяпер спатрэбіцца Айчыне. Прафесія, якой я аддаваўся, падрыхтавала мяне да прапанаванага мне задання, таму я яго прымаю» [5, с. 6].

У навеле «Gloria victis» людское шматгалоссе замяняе шматгалоссе дрэў: адзіныя сведкі тых трагічных падзей атуляюць безыменныя магілы інсургентаў і расказваюць ветру гісторыю паўстання.

У іх аповедзе таксама з’яўляецца вобраз Р. Траўгута, яшчэ больш гераізаваны і апаэтызаваны. Р. Траўгут атаясамліваецца са святым: «Іх правадыром быў чалавек святога імені, якое гучала: Рамуальд Траўгут. Пытаешся, чаму яго імя было святым? Бо паводле загаду Пана Бога ён пакінуў жонку і дзяцей, дабрабыт і спакой, усё, што песціць, усё, што радуе і з’яўляецца смакам жыцця, дзівам, скарбам, шчасцем, узваліўшы на плечы крыж свайго народа, ён пайшоў за агністым слупам, што ішоў па зямлі, і ў ім згарэў » [4, с. 4].

Не лішнім будзе прыгадаць і зафіксаваныя сучаснікамі словы самога Р. Траўгута, які наконт сваёй згоды прыняць кіраўніцтва паўстаннем, прыгаворанага ўжо тады да пагібелі, казаў так: «Я нікому не раіў падымаць паўстанне, наадварот, як былы вайсковец, я бачыў усю складанасць барацьбы без арміі і ўзбраення з дзяржавай, вядомай сваёй магутнасцю. Калі ўзброенае паўстанне павінна было ўспыхнуць у Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні, дзе я жыў, за некалькі дзён да пачатку паўстання да мяне звярнуліся з просьбай прыняць камандаванне. Разгубіўшыся, я апісаў усе перашкоды, як агульнага, так і асабістага парадку, і рэкамендаваў адмяніць рашэнне пра пачатак

паўстання. Высветлілася, што зрабіць гэта ўжо проста немагчыма. Тады я прыняў іх просьбу…» [3, с. 17].

Для У. С. Караткевіча постаць К. Каліноўскага стала знакавай. Пісьменнік прысвяціў тэме паўстання шэраг твораў, а вобраз К. Каліноўскага пры дапамозе гістарычных архіваў і ўласнага мастацкага апраўлення паўстаў у яго вельмі адметны і жывы.

У п’есе «Кастусь Каліноўскі» ў шэрагу асноўных герояў у першай дзеі К. Каліноўскага чытач бачыць не адразу. Калі сяляне рыхтуюць расправу над адным з паўстанцаў і панам Зарубам, з’яўляецца нейкі Падарожны. Мудры, чалавечны, ён не дазваляе мужыку Пархвену забіць інсургента Вастравуха. Высвятляецца, што загадкавы Падарожны – гэта К. Каліноўскі. Ён шчырай прамовай пераконвае сялян у тым, што паўстанцы адстойваюць інтарэсы мужыкоў, яны не ворагі. «Іншыя – гавораць. Гэты – як душу аддае», – зазначае Караліна [1, с. 13].

К. Каліноўскі сапраўды быццам не належыць сам сабе. Калі да яго падыходзіць гарадскі юродзівы Агей Блажэнны і кажа: «Дай што-небудзь Блажэннаму Агею… Не… Не грошы… Душу дай…», – Кастусь адказвае: «Аддам, Агей». Пазней, у размове з Каралінай, ён прызнаецца, што «жыве толькі таму, што для іншых» [1, с. 77]. Ужо на дадзены момант К. Каліноўскі ахвяраваў сваё жыццё Радзіме. Яна для яго ўсё.

Ён не мае сям’і і не можа яе стварыць, бо належыць усяму народу. Абараняючы сялянскага хлопчыка Яна, які анямеў пасля таго, як сквапнае панства спусціла на яго хартоў, Кастусь кажа: «Ты як мой сын. І для цябе я клянуся: ніколі ў жыцці ў мяне не будзе іншых сыноў, акрамя такіх, як ты. Я чалавек, я люблю, але пакуль я за адзін твой язык не вырву языкоў ва ўсіх тых, што цкуюць людзей сабакамі, – да таго часу я не буду ведаць ні сну, ні спакою, ні любові» [1, с. 13].

Кастусь не можа быць ні бацькам, ні мужам. Ён называе сябе «жаніхом радзімы, свабоды» [1, с. 65]. Юнак пакахаў Караліну, але не можа дазволіць сабе быць з ёй, бо павінен выконваць сваю місію. Большасць іх асабістых шчырых размоў заканчваецца агучваннем паролем паўстанцаў. Такім чынам, спрабуючы адно аднаму прызнацца ў каханні, яны прызнаюцца ў любові Беларусі.

Падчас размовы з князем Мсціслаўскім М. Мураўёў вельмі захапіўся сваім суразмоўцам, безумоўна, не ведаючы, што перад ім той самы К. Каліноўскі, якога ён на нарадзе з імператарам назваў львом беларускіх балот [1, с. 53] і ахарактарызаваў так: «Гэта ўтрапёны фанатык, чалавек каменнай волі, вялікага розуму, таленту… <…> Ён таленавіты арганізатар, ваявода, публіцыст. Ён любіць сваю ідэю» [1, с. 55]. Цікава, што такую вычарпальную характарыстыку

К. Каліноўскага мы атрымліваем з вуснаў яго вялікага ворага, графа-вешальніка.

К. Каліноўскі сур'ёзны, адказны, але тым не менш, ён імкнецца да атрымання і прадукавання пазітыўных эмоцый. Нават у самых безнадзейных сітуацыях ён знаходзіць у сабе сілы на ўсмешку: «Лягчэй вам стане, калі я плакаць буду? Жартуйце, хлопцы, жартуйце… Каб не вершы, не жарты – ета ж проста нам усім перавешацца трэба было б… самім… не чакаючы мураўёўскай ласкі» [1, с. 61].

У. С. Караткевіч стварае адмысловы вобраз місіі. Часам ён нагадвае святога. Так, насуперак усякай логіцы, ён давяраў Вітаўту Міншчыну пасля яго правалу на Магілёўшчыне. Кастуся ўпэўнівалі ў небяспецы гэтага прадпрыемства, на што паўстанец адказаў: «Ён – чалавек. Я не магу не верыць чалавеку» [5, с. 68]. Параф'яновіч здрадзіць, але Кастусь не будзе ненавідзець яго. Ён блаславуляе і Марыю пасля яе здрады, чым выклікае здзіўленне ва ўсіх прысутных. Нават старшыня следчай камісіі Шалгуноў зазначыць: «Святы ідыёт» [1, с. 86].

І пасля фізічнай смерці героя надыходзіць цудоўнае ўваскрашэнне, бо сама Беларусь кажа: «Вы – гэта я. Хіба я магу памерці? Устаньце з зямлі. Той, хто памёр, як вы, – не памірае» [1, с. 96].

Такім чынам, і Э. Ажэшка, і У. С. Караткевіч звярнуліся ў сваіх творах да постацей гістарычна вядомых кіраўнікоў паўстання. Рамуальда Траўгута Э. Ажэшкі і Кастуся Каліноўскага У. С. Караткевіча яднаюць любоў да Айчыны, адвага, самаахвярнасць адданасць свайму народу. Аўтары адзначылі выключную ролю правадыра паўстання, атаясамліваючы яго са святым, што цягне на плячах крыж свайго народа. Так, маюцца і адрозненні ў характары герояў: Р. Траўгут стрыманы, спакойны, у той час як К. Каліноўскі куды больш эмацыянальны і нават няўрымслівы. Абодва героі вельмі любяць жыццё. Менавіта таму апошнім канспіратыўным імем Кастуся было Ігнат па прозвішчы Вітажэнец (ад лац. vita 'жыццё'), а існасцю Траўгута, паводле Э. Ажэшкі, з'яўляецца «неўміручы Звышпераможца, Дух» [6, с. 3].

**Літаратура**


1. *Караткевіч У. С.* Збор твораў: У 8 т. Т. 8, кн. 1: П'есы; Нарысы. Мінск, 1990.
2. Эліза Ажэшка ў эстэтычнай прасторы славянскіх краін: зб. арт. / пад навук. рэд. С. П. Мусіенкі, М. М. Хмяльніцкага. Мінск, 2013.
3. *Dubiecki M.* Bohaterski naczelnik powstania styczniowego (Romuald Traugutt). Warszawa, 1918.
4. Słynni polacy Polesia: Romuald Traugutt (1826–1864). Konstanty Kalinowski (1838–1864) / Red.: Halina Bursztyńska. Brześć, 2004.
5. Інтэрнет-адрас: https://wolnelektury.pl/katalog/lektura/gloria-victis-gloria-victis.html.
6. Інтэрнет-адрас: https://wolnelektury.pl/katalog/lektura/gloria-victis-oni.html.